
# Дыяцэзія развіталася з найстарэйшым святаром у Беларусі

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
12.07.2020 00:00



Смерць чалавека заўсёды з'яўляецца вялікім ударам для блізкага акружэння. Калі памірае святар, у жалобу пагружаецца ўся парафіяльная сям'я, для якой ён быў сапраўдным бацькам.  26 чэрвеня адышоў у вечнасць кс. прэлат Юзаф Трубовіч. Шлях яго жыцця доўжыўся амаль 95 гадоў, з якіх 64 ён правёў у святарстве. За гэты час кс. Юзаф стаў духоўным правадніком для шматлікіх вернікаў Гродна. Яго ведалі многія пакаленні людзей: адных хрысціў, іншым дапамагаў пры заключэнні сакраментальнага сужэнскага саюзу, а яшчэ для кагосьці быў пастаянным спаведнікам...
†

Як адзначыў падчас пахавальнай св. Імшы біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч, сэрца кс. Юзафа было падобнае на Сэрца Езуса – заўсёды адкрытае для патрэб іншага чалавека. "Нягледзячы на пажылы ўзрост, святар стараўся знайсці час для кожнага. Заўсёды суперажываў чалавеку, які прыйшоў да яго за добрым словам і парадай", – заўважыў іерарх.

У кс. Юзафа быў асаблівы дар прыцягваць людзей да сябе. Ён быў здольны захапіць Богам і прыгажосцю Касцёла. Святара любілі дзеці і моладзь, а асабліва вернікі ў сталым узросце.

Кс. Юзаф лёгка знаходзіў кантакт з хлопцамі, якія прыслужвалі пры алтары. Тыя намагаліся пераймаць святара, гледзячы на яго сціплае і звычайнае жыццё. Таму не дзіўна, што больш за 10 былых яго міністрантаў прынялі святарскія пасвячэнні і сёння служаць на ніве Пана ў Беларусі, а таксама ў Латвіі, дзе ён жыў некаторы час.

Ксёндз прэлат сапраўды быў сціплым чалавекам.

Жыў у вельмі простых умовах. Не акружаў сябе багаццем ці якім-небудзь асаблівым камфортам. Меў толькі тое, што было неабходна для нармальнага існавання. А астатняе, як сам часта паўтараў, "не абавязкова для збаўлення".

Такім жа, якім было ўсё жыццё святара – спакойным і поўнасцю адданым Пану, была і яго смерць. Моцна трымаючы ў руках грамнічную свечку, кс. Юзаф зірнуў на вялікі крыж, які вісеў у спальні, заплюшчыў вочы і спакойна адышоў да Госпада… Пахаваны побач з гродзенскім касцёлам Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі, дзе служыў на працягу апошніх 20-ці гадоў.

Нам, сучаснікам, святар пакінуў прыгожае сведчанне таго, што заўсёды варта імкнуцца да дасканаласці, што варта жыць з Богам. Толькі такое жыццё будзе мець сэнс і значэнне.

У сваім завяшчанні, якое прачыталі пасля смерці, кс. Юзаф напісаў простыя словы: "Дзякую усім, каго я сустрэў у сваім жыцці, і прашу прабачэння ва ўсіх, перад кім

вінаваты. Ад усяго сэрца прашу аб малітве за маю душу”. Няхай жа выразам нашай удзячнасці памерламу святару будзе адданая малітва, каб Гасподзь у сваёй міласці паглядзеў на яго і сказаў: “Слуга добры і верны, увайдзі ў радасць гаспадара твайго!”.

**Кс. прэлат Юзаф Трубовіч нарадзіўся 6 студзеня 1926 года на Віцебшчыне ў вёсцы**

**Бацька быў шаўцом, маці – хатняй гаспадыняй.**

**Скончыў Вышэйшую духоўную семінарыю ў Рызе (Латвія). Там жа атрымаў прэзбітэрс**

**Значная падзея адбылася 30 верасня 1956 года.**

**Пасля пасвячэння 20 гадоў служыў у Латвіі: спачатку вікарыем у Ліепаі, потым пробаш**

**У Беларусь прыехаў у 1977 годзе. Служыў у гродзенскай парафіі Маці Божай Анёльска**

**У 1999 годзе быў скіраваны ў парафію ў Каменцы (дэканат Шчучын), дзе непрацяглы**

**23 снежня 1999 года прыбыў у гродзенскую парафію Беззаганнага Зачацця Найсвяце**